**«Ганаруся табою, мая Беларусь!»: сцэнарый выхаваўчага мерапрыемства ў шосты школьны дзень (5 – 9 класы)**

**Алена Антонаўна Будніцкая**,
настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі,
класны кіраўнік 10-га класа
Макараўскай сярэдняй школы
Бераставіцкага раёна

**Мерапрыемства па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню праводзіцца ў шосты школьны дзень (Дзень патрыёта), у аздараўленчым лагеры з дзённым знаходжаннем. Сцэнарый можа быць прыўрочаны да дзяржаўных свят і памятных дат. Вершы і песні аб прыгажосці прыроды Беларусі, працы і подзвігу, традыцыях у спалучэнні з гульнямі і творчымі заданнямі дапамагаюць выклікаць у школьнікаў патрыятычныя пачуцці, гонар за саваю Радзіму. Мерапрыемства ўключае Хвіліну маўчання ў знак памяці і павагі да гераічнага мінулага беларускага народа. Абавязковымі з'яўляюцца зварот да дзяржаўных сімвалаў, выкананне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.**

**«Ганаруся табою, мая Беларусь!»: сцэнарый выхаваўчага мерапрыемства ў шосты школьны дзень (5 – 9 класы)**

**Мэта:** выхаванне ў вучняў грамадзянскасці, патрыятызму, адказнасці і гатоўнасці дзейнічаць на карысць Радзімы.

**Задачы:** фарміраваць у вучняў пачуццё гонару за галоўныя сімвалы дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, за сваю краіну;

умацоўваць гістарычную памяць аб гераічным мінулым беларускага народа;

фарміраваць у юнакоў маральна-псіхалагічную і фізічную гатоўнасць да службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь;

далучаць навучэнцаў да гістарычнай спадчыны беларускага народа, выхоўваць павагу і развіваць цікавасць да роднай мовы, культуры, гісторыі;

развіваць пазнавальную актыўнасць і творчыя здольнасці.

**Абсталяванне:** чырвоныя і зялёныя паветраныя шары, сцяжкі, ноўтбук, мультымедыя, картачкі з прыказкамі, элементы Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, музычныя і песенныя аўдыязапісы.

**Папярэдняя праца:** зала афармляецца з выкарыстаннем дзяржаўнай сімволікі; арганізоўваецца кніжная выстава твораў беларускіх пісьменнікаў-патрыётаў, выстава вырабаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці вучняў і бацькоў.

**Ход мерапрыемства**

***На экране мультымедыя дэманструецца эпіграф да мерапрыемства:*** “Няма ў чалавека нічога прыгажэй і даражэй за Радзіму. Чалавек без Радзімы – бедны чалавек”. Я. Колас.

***Гучыць беларуская мелодыя. Выходзяць вучні.***

Чытанне верша Н. Гілевіча “Я – беларус”.

**Вучань 1.**

Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

**Вучань 2.**

Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя,
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма!

**Вучань 3.**

Я – беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля.

**Вучань 4.**

Я – беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!

– А што значыць быць беларусам?

**Вучань 1.** Быць беларусам – гэта быць вартым добрай славы Бацькаўшчыны.

**Вучань 2.** Быць беларусам – гэта шанаваць сваю родную мову, культуру, традыцыі.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Вучань 3.** Быць беларусам – гэта ведаць гісторыю свайго роднага краю, сваёй дзяржавы.

**Вучань 4.** Быць беларусам – гэта быць мужным, як нашы продкі ў час суровых нягод.

***Зварот да эпіграфа***

Настаўнік звяртаецца да эпіграфа "Няма ў чалавека нічога прыгажэй і даражэй за Радзіму. Чалавек без Радзімы – бедны чалавек". Я. Колас.

– Як вы разумееце гэтыя словы? *(Адказы вучняў.)*

Педагог знаёміць удзельнікаў з кніжнай выставай.

– Перад вамі творы беларускай літаратуры, у якіх – кранальныя прызнанні іх аўтараў у шчырай любові да бацькоўскай зямлі, адданасці і вернасці ёй. Любоў да Радзімы, на думку беларускіх паэтаў і празаікаў, напаўняе жыццё чалавека глыбокім сэнсам. Адчуванне сваёй непарыўнай злучанасці з бацькоўскай зямлёю, з народнай душою натхняе іх шчыра-ўзнёсла пісаць вялікую кнігу жыцця роднай краіны. Бацькаўшчына — гэта самы вялікі скарб, які беларусы павінны зберагчы і захаваць для нашчадкаў.

**Гучыць запіс песні "Мой родны кут".** *(Музыка І. Лучанка, словы Я. Коласа.)* На слайдах дэманструюцца здымкі мясцовых прыродных і гісторыка-культурных славутасцей.)

– Нельга не пагадзіцца з класікам беларускай літаратуры. Няма для чалавека нічога больш цудоўнага і даражэйшага за Радзіму. "Чалавек без Радзімы – бедны чалавек", – так пісаў Якуб Колас. Радзіма — гэта наш духоўны скарб, Сусвет, аснова, без якой мы — дым на папялішчы.

– Невычэрпны моўны скарб Беларусі — прыказкі. У іх адлюстроўваецца не толькі гісторыя, звычаі, быт, але і характар, душа народа. Чым больш чалавек ведае прыказак, тым больш народнага вопыту ён можа пераняць.

**Гульня « Складзі прыказку»**

Арганізоўваюцца каманды вучняў. Кожная каманда атрымлівае лісткі з прыказкамі, падзеленыя на дзве часткі. Трэба знайсці правільны працяг прыказкі.

| | |
|---|---|
| Усюды добра, | а дома лепей |
| Родная зямля | мякчэй чужой пярыны. |
| Усякай птушцы | сваё гняздо міла. |
| У сваім краі, | як у раі. |
| Дарагая тая хатка, | дзе радзіла мяне матка |
| Няма смачнейшай вадзіцы, | як з роднай крыніцы. |
| Той бацькаўшчыну любіць, | хто ёй сумленна служыць. |
| Усякаму мілы | свой куточак. |
| Родная зямелька, | як зморанаму пасцелька. |
| Чалавек без радзімы, | што салавей без песні. |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны герой.

– Назавіце прыказкі, якімі трапна можна вызначыць рысы патрыёта. *(Той бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць. Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны герой.)*

Гучыць мелодыя песні А. Аляксандрава і В. Лебедзева-Кумача “Свяшчэнная вайна”.

**Вучань 5.**

Ужо даўно адгрымела Вялікая Айчынная вайна. Але мы памятаем пра яе. У кожным кутку нашай краіны можна ўбачыць велічныя манументы, помнікі, абеліскі.

**Вучань 6.** Брэсцкая крэпасць, мемарыяльны комплекс “Хатынь”, абеліск "Мінск – горад-герой"… Мы заўсёды будзем памятаць подзвігі, імёны герояў.

**Вучань 7**. Не можа быць забыцця для тых, хто да апошняй кроплі крыві, да апошняга ўздыху абараняў нашу Айчыну, нашу родную зямлю.

**Вучань 8.** Увага! Хвіліна маўчання! *(Гукі метранома.)*

– У нашай краіне няма такой сям’і, якую б ні кранулі падзеі, іспыты вайны. Ад ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, дзяцей таго часу, былых малалетніх вязняў мы даведваемся, што ворагі хацеліператварыць нашу зямлю ў лагер смерці за калючым дротам. На карце Беларусі мы не знойдзем назваў многіх даваенных вёсак – іх знішчылі фашысты, як і Хатынь.

**Вучань 9.**

**Верш В. Жуковіча “Бусел над Хатынню”**

Пакружыўся над Хатынню бусел
Сонечна-пагодлівай вясной:
Коміны стаяць. І людзі ў скрусе.
Анідзе хаціны ні адной.
Заміраюць галасы людскія,
Гукі абуджальныя вясны,
І плывуць трывожныя такія
Тонкія жалобныя званы.
Пакружыўся над Хатынню бусел
і паплыў у светлую смугу.
Ён не ведаў болю Беларусі,
пэўна ж, ён адчуў яе тугу.
Пакружыўся бусел над Хатынню
І ў смузе пад воблакамі знік.
Папялішча ўсё яшчэ не стыне.
І ў грудзях не замірае крык.

– Сёлета мы святкавалі 80-годдзе Вялікай Перамогі. Мы свята захоўваем памяць аб воінах-абаронцах, нашых дзядах і прадзедах, якія змагаліся за нашу

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

беларускую зямлю. Сёння да нас прыйшла дачка ветэрана Вялікай Айчыннай вайны_____ Вам слова, паважаная (__________).

*Выступленне госці.*

**Настаўнік.**

– Колькі б выпрабаванняў не выпала на долю нашага народа, але беларуская зямля адраджалася, напоўненая любоўю, сілай духу і працай свайго народа. Беларус – гэта перш за ўсё заўзяты працаўнік. Спакон вякоў ён жыве сваёй працай. Лепшыя рысы беларусаў увасоблены і ў сучасным пакаленні. Пра гэта сведчыць наша выстава сямейнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Вучні разам з бацькамі прадстаўляюць выставу.

– Народная лялька, вышыўка і разьба па дрэве, саломапляценне і паперапластыка... Вырабы ўражваюць. І ў кожнай рабоце прыгожы настрой — тут і трапяткое стаўленне да гісторыі і традыцый нашай Радзімы, да традыцый сваёй сям'і. Бацькаўшчына — гэта самы вялікі скарб, які беларусы павінны зберагчы і захаваць для нашчадкаў.

*Гучыць фанаграма песні «Спадчына» (муз. І. Лучанка, сл. Я. Купалы).*

– Спадчына! Якое прыгожае слова і які глыбокі сэнс! Спадчына – гэта нашы народныя звычаі і культура. Гэта і працавітасць, і мужнасць, і гасціннасць, і сумленнасць. Усе гэтыя якасці беларускага народа – наша спадчына, наш духоўны скарб. Хачу запытацца вось аб чым: «Што аб'ядноўвае беларускі народ, старэйшае і малодшае пакаленні?» *(Любоў да сваёй Радзімы.)*

**Вучань 10**. Мы жывём у мірнай, незалежнай і шчаслівай краіне. Сёння да нас прыйшлі вайскоўцы пагранічнай заставы, якія днём і ноччу ахоўваюць рубяжы нашай Радзімы. Мы ведаем, што пагранічнікі — гэта "шчыт Радзімы". Гэта мужныя, самаадданыя людзі!

**Настаўнік.** З гонарам і павагай прадастаўляю слова начальніку пагранічнай заставы "Русакі" _______.

*Зварот ваеннаслужачых да вучняў, уручэнне юнакам і дзяўчатам лістоў падзякі і грамат за актыўны ўдзел у ваенна-спартыўных гульнях і мерапрыемствах.*

**Настаўнік.** Беларусь – наша Радзіма, бо мы тут нарадзіліся, бо яна наша зямля, наша Беларусь для нас родная. Каб звацца беларусам, трэба ведаць гісторыю развіцця сваёй краіны, яе дасягненні, яе сённяшні дзень.

– Што ўшаноўвае наш народ? (Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя сімвалы (герб, сцяг, гімн), Перамогу, незалежнасць, абаронцаў, працу, маці, сям'ю, моладзь, навуку, веды, пісьменнасць, літаратуру, права.)

**Заданне «Сімволіка»**

Камандам прапаноўваецца скласці з элементаў герб Рэспублікі Беларусь. Якая каманда першай выканае заданне, тая і перамагае.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Дзвюм камандам прапаноўваецца прадставіць старонкі з кнігі "Дзяржаўныя сімвалы Беларусі". Першая старонка – "Дзяржаўны сцяг Беларусі", другая – "Дзяржаўны герб Беларусі". Трэцяй камандзе – падрыхтаваць пытанні для ўсіх удзельнікаў.

**Пытанні**

- ✓ Знакам чаго з'яўляецца злучэнне Зямлі і Сонца на гербе Рэспублікі Беларусь? *(Знак жыцця, надзеі на росквіт Беларусі.)*
- ✓ Калі адзначаецца Дзень Незалежнасьці Рэспублікі Беларусь? *(3 ліпеня.)*
- ✓ Назавіце дзяржаўныя сімвалы нашай краіны? *(герб, сцяг, гімн.)*
- ✓ Калі адзначаецца Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь? *(Другая нядзеля мая.)*
- ✓ Як пачынаецца Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь? *(Мы – беларусы, мірныя людзі, сэрцам адданыя роднай зямлі.)*
- ✓ Як называецца Асноўны закон нашай Рэспублікі? *(Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.)*
- ✓ Што ўяўляе сабой наш Дзяржаўны сцяг? *(Тры колеры: чырвоны – знак Сонца, зялёны – колер дабра і свету, белы – свабода. Арнамент гаворыць аб працавітасці нашага народа, ромб у цэнтры – сімвал ключа да шчасця.)*
- ✓ Прозвішча аўтара музыкі Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь – Сакалоўскі. А як яго імя? *(Нестар.)*

– Герб, гімн і сцяг – гэта галоўныя сімвалы незалежнасці, якія перадаюць гісторыка-культурную спадчыну нашага народа, падкрэсліваюць нацыянальны дух і годнасць беларускіх грамадзян. Мы, як сапраўдныя грамадзяне сваёй краіны, ведаем свае сімвалы і ставімся да іх з павагай. І сваю любоў да Радзімы, да роднай зямлі мы павінны пацвярджаць сваімі справамі на карысць грамадству.

– Мы, беларусы – адзіная нацыя, якая выбрала свой уласны шлях развіцця і цвёрда яго прытрымліваецца. Наша сіла – у адзінстве. Калі мы адзіныя – нам не страшныя ніякія выпрабаванні. Будучыня нашай краіны залежыць ад кожнага з нас.

*Удзельнікі мерапрыемства стоячы співаюць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.*

**Літаратура**

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

1. День народного единства как символ справедливости, когда гордое «Мы — белорусы» зазвучало на весь мир [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vitvesti.by/obshestvo/my-belorusy-den-narodnogo-edinstva-kak-simvol-spravedlivosti-kogda-gordoe-zazvuchalo-na-ves-mir.html – Дата доступа: 10.09.2025

2. Евушко, Ю. Ко дню Единства 17 сентября [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://stihi.ru/2024/11/06/7266 – Дата доступа: 10.09.2025

3. История и смысл Дня народного единства [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/novosti/obshchestvenno-politicheskie-i-v-oblasti-prava/2023/september/75380/ – Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь – Дата доступа: 10.09.2025

4. Меркуров, Ю. Мир [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://stihi.ru/2024/03/22/2430 Дата доступа: 10.09.2025

5. Бядуліна, Г.Ф. Метадычнае суправаджэнне ідэалагічнай работы ў агульнаадукацыйных установах: дапаможнік для нам. дырэктараў шк. па выхаваўчай працы, кл. рук., педагогаў / Г.Ф. Бядуліна. – Мінск : НІА, 2007.